**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2019 г.

## Мерапрыемствы да тыдня роднай мовы

**6 лютага**

Для вучняў СШ №8 адбыўся паэтычны вечар «Ён наш паэт, ён наша слава», прысвечаны 105-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. Вядучыя расказалі прысутным цікавыя звесткі аб жыцці і творчасці паэта. Гучалі вядомыя вершы, урыўкі з паэм, музычныя кампазіцыі: «Алеся», «Ліст з палону», «Я хаце абавязаны прапіскаю». Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «І сэрца абпалена смагай радка».

ЦРБ, 68 чал.

**21 лютага**

У час выступлення літаратурна-паэтычнай групы «Рытм» - «Мелодыя роднага слова», гасцямі якога сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, вядучыя расказалі пра асноўныя этапы станаўлення беларускай літаратуры, прачыталі вершы беларускіх паэтаў, правялі літаратурную віктарыну «Прыгарніся да роднага слова». Мерапрыемства завяршылася праглядам відэафільма «Роднай мовы пераліві».

ЦРБ, 37 чал.

**22 лютага**

У бібліятэцы адбыўся урок беларусазнаўства «Вобразная, вольная, пявучая – мова беларуская мая» для вучняў 4 класаў Гарадзецкай сярэдняй школы. Размова ішла пра гісторыю ўзнікнення Дня роднай мовы, гучалі вершы пра родную мову. Дзеці паказалі добрыя веды ў перакладзе слоў з рускай на беларускую мову, разгадалі загадкі і разам заспявалі «Беларускую калыханку». Відэапрэзентацыя да 105-годдзя А. А. Куляшова пазнаёміла прысутных з біяграфіяй і творчасцю выдатнага беларускага паэта. У гонар паэта-юбіляра сумесна са старшакласнікамі арганізавана акцыя «Размаўляй са мной па-беларуску».

Гарадзецкі філіял, 27 чал.

**25 лютага**

Удзельнікі літаратурна-паэтычнай гадзіны «Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся» даведаліся аб узнікненні свята, аб беларусах-першаасветніках, праслухалі выступленне літаратурна-паэтычнай групы «Ветразь», паўдзельнічалі ў віктарынах «Апранайся па-беларуску», «Словаведы», пазнаёміліся з падборкай кніг беларускіх аўтараў на выставе «Бібліятэкар раіць прачытаць». Завяршылася гадзіна праглядам рэкламнага

роліка «Смак роднай мовы». На працягу дня дзейнічала акцыя «Маё любімае слова па-беларуску».

Арэхаўская ПБ, 25 чал.

**27 лютага**

Творчы вечар-прэзентацыя паэтэсы Надзеі Іванаўны Момлік «Стихи, меняющие жизнь» пачалася ў абеліска ў в. Барысаўка, дзе аўтар прачытала свой верш «Маці ў жалобе» і працягнуўся ў глядзельнай зале Дзівінскага цэнтра культуры і вольнага часу. Гасцямі вечара сталі вучні і настаўнікі Кіселявецкай СШ, якія подрыхтавалі літаратурнае выступленне пад кіраўніцтвам школьнага бібліятэкара. Аўтар пазнаёміла прысутных з новымі паэтычнымі творамі, пакінула ўсім жадаючым аўтографы на старонках выдання. Увазе гледачоў арганізавана выстава «Паэзіі святое прызначэнне». Сустрэча суправаджалася відэапрэзентацыяй «Мне сняцца сэрцу родны сцяжынкі».

Дзівінскі філіял, 55 чал.

## Мерапрыемствы да Дня абаронцаў Айчыны

**13 лютага**

Урок памяці «Эхо чужой войны», прысвечаны 30-годдзю вывада савецкіх войскаў з Афганістана, праведзены для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання.

У ходзе мерапрыемства расказана аб вайне ў Афганістане, аб беларускіх воінах-інтэрнацыяналістах, паказаны дакументальны фільм «Солдаты необъявленной войны». Ўспамінамі пра свой удзел у ваенных дзеяннях на тэрыторыі Афганістана падзяліўся старшы прапаршчык Старун Фёдар Аляксандравіч. Мерапрыемства завяршылася праглядам відэароліка кобрынскага барда Ю. Харэвіча «Помните».

ЦРБ, 38 чал.

**15 лютага**

Гісторыка-літаратурная гадзіна «Пока мы живы – помнить надо» праведзена супрацоўнікамі цэнтральнай раённай бібліятэкі сумесна з кінатэатрам «Вясёлка». На фоне агульных звестак пра Афганістан, расказана пра службу беларускіх воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія пайшлі на Афганскую вайну. Завяршылася мерапрыемства праглядам фільмаў «Афганистан. Война миров» і «Афганистан. Я помню»..

Лукская СШ, 42 чал.

**18 лютага**

Бібліятэкарам праведзены вечар памяці «Не может быть забвения», прысвечаны 30-годдзю вывада савецкіх войскаў з Афганістана. Госцем мерапрыемства стаў старшыня сельскага выканаўчага камітэта Скакун У. Ф., які прадэманстраваў тэматычныя відэапрэзентацыі. Памяць пра воінаў-афганцаў ушанавалі хвілінай маўчання. Бібліятэка прадставіла кніжную выставу «Мужеством измеренная жизнь».

Верхалеская ПБ, 65 чал.

**25 лютага**

Гасцямі літаратурна-музычнай кампазіцыі «Гэтых дзён ня змоўкне слава» сталі мужчыны Кобрынскай РААА «БелТІЗ». Старшыня арганізацыі Смяховіч Валянціна Мікалаеўна звярнулася да прысутных са словамі прывітання і добрымі пажаданнямі і ўручыла памятныя сувеніры.

Сапраўдным падарункам для прысутных стала канцэртная праграма, падрыхтаваная Кірыеўскім А. П. і вакальнай групай цэнтральнай бібліятэкі.

ЦРБ, 39 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 лютага**

У рамках праекта «Хобі-цэнтр 55+» у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшло пасяджэнне гісторыка-краязнаўчай секцыі клуба «Універсітэт залатога веку». Паклоннікі творчасці знакамітага італьянскага жывапісца Рафаэля Санты наведалі арт-гадзіну «Великий мастер Высокого Возрождения». Прысутныя прагледзелі прэзентацыю «Загадки и чудеса Рафаэля» і праслухалі расказ мастацтвазнаўцы Шчур Л. З. аб карцінах і партрэтах, створаных па біблейскіх матывах.

ЦРБ, 36 чал.

**13 лютага**

Пасяджэнне гісторыка-краязнаўчай секцыі клуба «Университет золотого возраста» адбылося ў рамках праекта «Хобі-цэнтр 55 +». Тэма пасяджэння: «Первая Всероссийская перепись населения 1897 года. Кобринский уезд». У. Бордзюг азнаёміў удзельнікаў мерапрыемства з цікавымі фактамі па гэтай тэме. Пасяджэнне суправаджалася відэапрэзентацыяй.

ЦРБ, 36 чал.

**20 лютага**

Адбылася гадзіна духоўнасці «Живое слово мудрости духовной», прысвечаная святу Грамніц. Бібліятэкар расказала пра гісторыю ўзнікнення і значэнне свята для хрысціян, зрабіла агляд літаратуры, прадстаўленай на кніжнай выставе «Православные праздники и чудотворные молитвы на весь год». Настаўнік нядзельнай школы Л. А. Данілевіч павіншавала ўсіх прысутных са святам, а юныя выхаванцы выканалі святочныя песні і прачыталі вершы.

Гарадзецкі філіял, 22 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81